# КУЛЬТУРНАЯ ТЭМАТЫКА Ў НЕСПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ МЕДЫЯ: ПРАБЛЕМА СІСТЭМНАГА ПАДЫХОДУ

***Н. В. Саянава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*natumi@mail.ru*

Аналізуецца неабходнасць сістэмнага аналітычнага падыходу да асвятлення падзей і працэсаў у сферы культуры і мастацтва, роля культурафарміруючай функцыі журналістыкі ў сучасным медыяасяроддзі.

***Ключавыя словы:*** культура; мастацтва; каштоўнасці; функцыі; СМІ; журналістыка; кантэнт.

# CULTURAL THEMES IN NON-SPECIALIZED MEDIA: THE PROBLEM OF A SYSTEMIC APPROACH

***N. V. Sayanava***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str, 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. V. Sayanava (natumi@mail.ru)*

The need for a systematic analytical approach to the coverage of events and processes in the sphere of culture and art, the role of the culture-forming function of journalism in the modern media environment is analyzed.

***Key words:*** culture; art; values; functions; media; journalism; content.

На фоне глабальных сацыяльных і тэхналагічных трансфармацый культурна-асветніцкая функцыя СМІ як грамадскага інстытута ў сучасны перыяд не з'яўляецца прыярытэтным фактарам уплыву на свядомасць аўдыторыі. Цікаўнасць да літаратуры і мастацтва як сродку фарміравання асобы саступае месца больш хуткаплыннаму ўздзеянню відэакантэнта, прычым пераважна ў кароткачасовых фарматах тыпу stories або reels. «Длительное последовательное чтение объ-

емных текстов отходит на второй план, для современной молодежи характерны рассредоточенность внимания, стремительно растущая многозадачность и быстрое переключение с одной деятельности на другую» [1, с. 5]. Спецыялізаваныя СМІ ў сферы культуры не карыстаюцца попытам масавай аўдыторыі і ў большасці не імкнуцца да яе пашырэння за кошт адаптацыі да патрабаванняў сучаснага канвергентнага медыяасяроддзя. Выданні, разлічаныя на шырокае кола чытачоў, безумоўна, больш актыўна прадстаўлены ў віртуальнай прасторы, але фарматы і падыходы да асвятлення культурных падзей і працэсаў наўрад ці дазваляюць атрымаць цэласнае ўяўленне пра развіцце беларускага мастацтва і літаратуры на сучасным этапе.

Інфармацыйнае агенцтва БелТА ў асвятленні культурнай тэматыкі найчасцей выкарыстоўвае фармат стандартнай або дэталізаванай нататкі, прысвечанай пэўнай падзеі: адкрыццю выставы, юбілейнай нагодзе славутага калектыва, міжнароднаму фестывалю, бенефісу вядомых артыстаў, прэм’еры спектакля, выданню новай кнігі і інш. (напрыклад, «Международный форум дирижеров соберет в Могилеве участников из Беларуси и России», 06.02.2024; «В Мирском замке рассказали, чем он удивит в 2024 году», 01.02.2024). Разнапланавы кантэнт пра сферу мастацтва, пераважна ў інфармацыйных жанрах, прадстаўлены таксама на сайце ІА «Минск-новости», падобная рэдакцыйная палітыка ў вялікай ступені характэрная і для партала «СБ. Беларусь сегодня». У выданнях «Минский курьер» і «Народная газета» друкуюцца палосныя партрэтныя матэрыялы, прысвечаныя знакамітым асобам Беларусі (у большай ступені носяць біяграфічны, не творчы характар) (М. Вітальеў «Ростислав Янковский. Камертон эпохи», «МК», 19.01.2024; В. Пяпляеў «Крещенная талантом», «НГ», 19.01.2024), час ад часу сустракаюцца рэпартажы і водгукі («Концерт-сюрприз и вальс на старый Новый год в Большом театре Беларуси. Как это было», «МК», 02.02.2024; Н. Пахамовіч «Важный выбор», «МК», 06.02.2024), але яны маюць хутчэй агляднае, чым даследчыцкі ракурс. Сярод вядучых традыцыйных СМІ найбольшую ўвагу асвятленню культурнай праблематыкі надае медыяхолдынг «Звязда», на сайце і ў друкаванай версіі газеты прадстаўлены матэрыялы пра розныя сферы мастацтва, у прыватнасці, не толькі найбольш папулярныя літаратуру, кіно, тэатр, але і выяўленчае мастацтва, музыку, гісторыю і этнаграфію (Л. Голад «Да дня нараджэння Міхаіла Савіцкага НЦСМ запусціў унікальную выставу», 08.02.2024; А. Дзядзюля «Таямніцы народнага

мужчынскага строю», 29.01.2024). Пасля кожнага тэксту чытачу прапануецца падборка тэматычна блізкіх матэрыялаў, што патэнцыяльна спрыяе пашырэнню ўцягнутасці. Да пазітыўных характарыстык можна таксама аднесці разнастайнасць у жанравым плане, аднак інфармацыйны падыход і тут пераваладвае, сустракаюцца замалеўкі, інтэрв'ю і агляды (В. Паклонская «Мінчанка Лізавета Канстанцінава малюе пялесткамі і травінкамі», 03.02.2024; Л. Рублеўская «Калекцыянер імгненняў, гаспадар капібары. Гутарка з кніжным графікам Міхаілам Дайлідавым», 26.01.2024; Т. Сідарава «Дванаццаты нумар «Немана» нагадвае чытачам пра тое, што павінна быць у кожнага», 02.02.2024), але больш глыбокіх, аналітычных матэрялаў амаль няма. Некаторыя з рубрык не абнаўляюцца рэгулярна і, улічваючы інфармацыйны складнік прадстаўленага (часам даволі састарэлага) кантэнта, не яўялюць актуальнасці пры праглядзе.

Магчыма, самі культурныя аглядальнікі медыя маюць сістэмнае ўяўленне пра тэндэнцыі і перспектывы сучаснага літаратурнага, кінематаграфічнага, тэатральнага працэсу ў Беларусі, аднак зацікаўленаму чытачу дастаткова цяжка скласці цэласны погляд менавіта за кошт адсутнасці паўнавартасных і рэгулярных аналітычных публікацый у СМІ. Экспертны погляд крытыка, такім чынам, для большасці сучасных спажыўцоў усе часцей замяняецца чарговым (нярэдка непрафесіянальным) блогам у сацыяльных сетках, такія акаўнты ў сукупнасці дастаткова легка і без асаблівых намаганняў перацягваюць аўдыторыю, таксама, між тым, не даючы паўнавартаснага аналізу культурных феноменаў.

Кліпавае мысленне як характарыстыка сучаснага маладога пакалення ў апошнія гады неаднаразова становіцца прадметам навуковай цікаўнасці даследчыкаў. Аднак фарміраванню гарманічнай асобы з гуманістычным светапоглядам, устойлівай сістэмай каштоўнасцей і імкненнем да прафесійнай і творчай самарэалізацыі з самага пачатку развіцця журналістыкі як грамадскага інстытута садзейнічалі СМІ, скіраваныя на выкананне не толькі інфармацыйнай, ідэалагічнай, арганізатарскай, але і культурафарміруючай, адукацыйнай функцый. «З'яўляючыся па сваей сацыяльна-грамадскай сутнасці прадуктам культуры, прэса як артэфакт уяўляе сабой носьбіта культурных каштоўнасцей, больш за тое – стваральніка іх у адмысловай форме праз камунікатыўную функцыю», адзначае Н. В. Кузьміч [2, с. 568]. Амаль аналагічную думку крыху раней падкрэслівала даследчыца і крытык Л. Цімошык: «Роля СМІ па захаванню культуры рэалізуецца адразу

ў некалькіх кірунках: калі журналісты дапамагаюць вырашаць праблемы з захоўваннем іншых культурных з'яў, форм і артэфактаў і калі іх дзейнасць накіраваная на гуманізацыю (захаванне чалавека) наогул» [3, с. 402]. Магчыма, сучасным беларускім выданням варта актывізаваць не толькі факталагічнае адлюстраванне шматлікіх падзей у сферы культуры, якія адбываюцца, сапраўды, часта і ў розных накірунках, але і больш маштабныя назіранні за пэўнымі працэсамі і тэндэнцыямі, тым самым паступова выхоўваючы на будучыню інтэлігентнага, зацікаўленага і нераўнадушнага чытача і гледача.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Голикова М. А.* Трансформация роли читателя в эпоху гипертекста [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/transformatsiya-roli-chitatelya-v-epohu-giperteksta (дата обращения: 08.02.2024)
2. *Кузьміч Н. В.* Некаторыя асаблівасці рубрыкі «Книжный навигатор» («СБ. Беларусь сегодня») [Электронны рэсурс]. URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/235199/1/567-570.pdf (дата звароту: 08.02.2024)
3. *Цімошык Л.* СМІ як сацыяльны інстытут культуры [Электронны рэсурс] URL: https://elib.bsu.by/bitstream/1 23456789/134212/1/Timosh%20L.%20pdf.pdf (дата звароту: 08.02.2024)